Перш чым пасланць, званю С.І.Законнікаву (ён тады працаваў загадчыкам сектара аддзела культуры ЦК КПБ. — **Рэд.**): хоць некага пастаўлю даведама. Ён: "Не раю. Трэба сказаць Аляксандру Трыфанавічу. Я: "Кузьмін сваю справу зрабіў, перадаў Дзяльцу загад на забарону. Ты ўсё ж паслухай тэкст, так сабе, дзеля цікаўнасці, я ўсё роўна перадам".

Чытаю. (Падаецца канчатковы варыянт тэлеграмы. — **Рэд.**)

Срочная. Москва. ЦК КПСС товарищу Зимянину М.В.

Глубокоуважаемый Михаил Васильевич

20-го ноября вечером по указанию тов. Севрука В.Н. в Минске на завершающей стадии прекращено издание 3-го тома Собрания сочинений народного писателя Белоруссии депутата Верховного Совета республики лауреата Государственной премии СССР БССР Василя Быкова из-за содержащейся там повести Мертвым не больно. Повесть опубликована Новым миром и Маладосцю, во многих странах вышла книгой. На всех международных встречах издатели особенно соцстран упрекают нас почему этой книги нет на Родине Быкова. На последней ММКВЯ эти упреки к счастью как нам казалось были уже сняты нами. Маловерам показывалась подписная корректура тома.

Решение тов. Севрука В.Н. объективно носит антисоветский противозаконный реакционный характер. Об этом недоумении уже знает весь интеллектуальный Минск значит узнает и весь мир.

Дорогой Михаил Васильевич Спасите пожалуйста значительную духовную ценность от средневекового костра а нашу издательскую практику от позора. Повесть талантлива, полностью отвечает духу соцреализма если его понимать здраво а не вульгарно-социологически.

С искренним уважением и верой в победу разума

Директор издательства Мастацкая літаратура

Дубенецкий Михаил Федорович

Сяргей: "Надта вострая. Не варта б называць Сеўрука".

Я: "Не назваць, дык некалі там памыюць рукі ад гэтае справы, скажуць, што рэспублікі самі вырашаюць такія пытанні. А тут я прышыю дакументальна іх да гэтай справы, няхай не хаваюць галаву".

Сяргей: "Я ўсё ж такі скажу Кузьміну пра ваша рашэнне".

Я: "Толькі хутчэй, Сяргей Іванавіч, я хацеў бы, каб тэлеграма дайшла сёння ж".

Чакаю 20 мінут. Званю. Сяргея няма. Праз мінут 10 паўтараю званок. І так кожныя 10—15 мінут. А Сяргея няма. Значыць, няма ў мяне ўжо гэтага сёння. А там субота ці нядзеля — усё роўна. Іду дапрацоўваць тэкст. Пачатак "Толькі што, пад націскам Сеўрука..." мяняю на: "20-га лістапада вечарам па ўказанні тав. Сеўрука У.М...". Узмацняю міжнародны аспект. Дадаю, што за мяжою выдаўцы ўжо ведаюць аб падрыхтоўцы 3-га тома Васіля Быкава з аповесцю "Мёртвым не баліць". Узмацняю ацэнку ўчынка Сеўрука. Мацней афармляю просьбу. Замест "ратуйце становішча" пішу: "Выратуйце, калі ласка, значную духоўную каштоўнасць ад сярэдневяковага кастра, а нашу выдавецкую практыку — ад ганебнага слупа". Апошнія два словы пераправіў на "...ад ганьбы".

На другі дзень я ўсё ж такі пацікавіўся: "Дзе ты быў, Сяргей?". Ён сказаў, што вярнуўся дадому вельмі позна ў сувязі з фестывалем "Беларуская музычная восень", што Кузьміна ён не бачыў, а Антановічу расказаў. Той спачатку быў шакіраваны, як сцвярджае Сяргей, а пасля быццам бы ўхваліў: "А што, можа, гэта і выратуе. Мы ж ніхто так не скажам, як ён", гэта значыць, як я.

22 лістапада, нядзеля. Будучы хворым, пайшоў на працу з намерам выклікаць неабходных супрацоўнікаў, каб падрыхтаваць адпраўку тэлеграмы ў якасці службовага дакумента. Прыватны, думаю, тэлеграф не прыме, а то і перадасць не туды. Нікога з патрэбных мне людзей на кватэрах не аказалася. Пазваніў галоўнаму. Сказаў, што пакідаю на стале рукапіс тэлеграмы. Папрасіў арганізаваць перадрук згодна з правіламі тэлеграфа, паставіць пячатку выдавецтва і прынесці мне на подпіс. Пазваніў Ірыне Міхайлаўне.

23 лістапада яшчэ да 10 гадзін раніцы ўсё было выканана, як я і прасіў. Тэлеграму павезлі на Галоўпаштамт. Каля 11 гадзін мне ўручылі завераную копію (пра гэта я прасіў сакратарку) і квітанцыю тэлеграфа аб прыёме. Дзень, а то і два можна быць "спакойным".

24 лістапада — "ціха".

25 лістапада В.А.Каленчыц па тэлефоне: "Пасылаў тэлеграму?". Я: "Пасылаў". Ён: "І пра Сеўрука пісаў?". Я: "Пісаў". Ён: "Вось гэта зусім дрэнна. Нашто яго чапляць?". — "А на тое, — кажу, — каб не адхрысціліся там ад гэтай справы. Гэта раз. А падругое, я даўно збіраюся прышпіліць яго да нечага канкрэтнага і важнага. Ён з уласнае ахвоты стаў оберцэнзарам СССР". Яшчэ некалькі мінут у такім жа тоне. В.Каленчыц пачаў палохаць мяне, што мне гэта пагражае немалымі непрыемнасцямі, што я ж закрануў ЦК КПСС, у адкрытым тэксце засведчыў практыку партыйнага кантролю друку, нарабіў непрыемнасцей А.Т.Кузьміну і г.д.

Пасля маіх "упартых", як ён сказаў, довадаў: "Значыць, увесь агонь бярэш на сябе?".

У гэты ж дзень Сяргей (па тэлефоне): "Кузьмін вельмі на вас пакрыўджаны. Незадаволены, нашто было называць Сеўрука. Абвінавачвае мяне, што гэта я вам яго назваў".

26.11. Васіль Быкаў: "Трэба сустрэцца". Даю згоду. Вечарам сустрэліся. Васіль Быкаў выказаў намер таксама паслаць у той жа адрас тэлеграму, а можа, і М.А.Суславу. Я быў схільны на апошні адрас, паколькі першы ўжо выказаў свае адносіны да справы. Васіль Быкаў яшчэ сказаў, што калі не атрымаецца, дык ён сам спыніць збор твораў на 2-м томе. Я ўхваліў такое рашэнне.

27.11. Васіль Быкаў: "Размаўляў з уплывовымі сябрамі з Белакаменнай. Сказалі, што справа прыняла там вельмі непажаданае развіццё. Аказваецца, яшчэ ў 1966 годзе М.А.Суслаў сваёй жорсткай рэзалюцыяй безапеляцыйна паставіў крыж на аповесці. Пасля гэтага Сеўрук як "барацьбіт" за культуру, наадварот, зрабіў кар'еру. Што ж, Міхась Фёдаравіч, нам у такой сітуацыі нічога не застаецца, як праглынуць пілюлю. Я вельмі вам удзячны і вельмі прашу, каб вы не надта перажывалі. Можа, асабіста вам не будзе пагрозы. Ну, а том выйдзе і без гэтай аповесці. Думаю, што не сёння-заўтра мне загадаюць забраць яе адтуль і даць нешта іншае".

Я: "Жалезная логіка і паслядоўнасць у белакаменцаў — не ў вашых сяброў, а ў тых, што над імі і над усімі намі, лагічна і вы вырашылі. Вось толькі я — суцэльны алагізм. Мне, напрыклад, імпанаваў ваш намер спыніць чатырохтомнік на 2-й кнізе. А калі і не спыняць, дык 4-ты даць поўным, як мы яго і склалі. А 3-ці пакінуць без "Мёртвых". Такі "том"-сшытак быў бы надоўга адпаведным помнікам. Добра было дарэвалюцыйным выдаўцам. Яны не запаўнялі нічым плошчу, з якой цэнзура нешта выкідала. А так — з белымі плямамі — кніга, газета выходзілі ў свет. Ох, якім цікавым быў бы наш гэты том, калі б яго выдаць адпаведна той практыцы!

А наконт мяне? Пачакаем, як будуць разгортвацца падзеі. Скажу толькі адно: на калені я не стану, каяцца не буду і не буду вымольваць сабе прабачэння".

28, 29.11. Субота, нядзеля. Турбаваць мяне няма каму. Не да мяне. Хто адпачывае, хто перажывае. Затое даведаўся, што на Усесаюзнай нарадзе ідэалагічных работнікаў, якая была гэтымі днямі, М.В.Зімянін паўгадзіны каменціраваў маю тэлеграму. Вядома, у адмоўным плане. Час ад часу не лягчэй!

30.11. Сяргей выклікаў да А.Т.Кузьміна. Я папрасіў, каб перанёс гэтую сустрэчу на заўтра таму, што дрэнна сябе адчуваю, ды і не ведаю, калі прыедзе ўрач. А ўрач мне сёння патрэбны: прыняты апошні ўкол пеніцыліну, замест яго будзе нешта іншае прапісана.

1.12. Званок Сяргея: "Быць у Кузьміна а 13-й гадзіне. Вельмі прашу не быць агрэсіўным. На яго эмоцыі адказвайце стрымана. А лепш спярша зайдзіце да мяне, параімся разам".

(Заканчэнне на 4-й стар.)

Народная Воля

12 ЖНІЎНЯ 1998 г.

Злое вогнішча

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)

А палове 13-й Валянцін прыслаў машыну. Пад'ехаў пад той будынак і машыну адпусціў, ведаючы, што не хутка адтуль выберуся. Здзівіўся, што ўжо абы-які супрацоўнік апарату не дасць каманду міліцыянеру, каб прапусціць. Такога права, аказваецца, ужо не маюць ні інструктары, ні загадчыкі сектараў. Сяргей "арганізаваў" памочніка А.Т.Кузьміна, і гэты пазваніў міліцыянеру, сказаў, што "па выкліку Кузьміна".

Як і дамаўляліся, зайшоў да Сяргея. Атрымаў інструктаж учарашняга ўзору: не быць агрэсіўным.

Даведваемся, што А.Т.Кузьміна ў кабінеце няма, некуды паехаў, але ж, як сказалі **там**, хутка павінен быць. Пасля 13-й Сяргей пайшоў у разведку. І даўгавата не вяртаўся. Нарэшце, прыкладна праз паўгадзіны, прыйшоў з паведамленнем ад Кузьміна, што мая сустрэча з ім пераносіцца на іншы дзень, які ён сам і вызначыць. Кажа, што ў яго цяпер вольных 5—10 мінут, а на Дубянецкага трэба яму гадзіну-паўтары.

Затое А.Т.Кузьмін ламае цяпер галаву, ці не кансультаваўся я з кім-небудзь з непажаданых асоб у Маскве наконт пасылкі тэлеграмы. Ды і акружэнне ў мяне, маўляў, у выдавецтве "не внушает доверия", "усякія там Р... С... К...".

Надта цікавыя рэбусы сталі тут развязваць: шукаюць "групу"; адзін — дык яшчэ не страшна, а вось калі такіх ужо некалькі "смутьянов", — гэта ўжо горш.

Дадому вярнуўся недзе пасля 16-й. Там, у тых доўгіх калідорах, сустракаўся то з адным, то з другім. Адзін пацiснуў руку, сказаўшы: "За мужнасць. Трымайся". Другі паскардзіўся, што "дрэнна функцыянуе **наша** сістэма", раз членаў яго сям'і цэлую восень "ганялі ў бездапаможныя калгасы на сельгаспрацы". "Мяняць трэба сістэму", — заключыў ён. Я не адрэагаваў аніяк. **Сваю** сістэму я, як магу, "мяняю", ці хаця б раблю яе больш лагоднай. А ты, думаю, толькі і здольны "з хустачкай у роце" папішчаць. А можа, нават вырашыў мяне "раскалоць".

Трэцім сустрэчным быў В.А.Каленчыц. Ён мне асабіста выказаў тое, што і па тэлефоне. Я таксама адказваў, як і тады, толькі больш разгорнута. Але быў у яго і новы нюанс. Так хітра-хітра, спадзеючыся, што падловіць мяне на хлусні, спытаў: "А ты нідзе не спасылаўся на Кузьміна? Нідзе не ўпісваў яго прозвішча?". Я сказаў: "Чаму ж нідзе? На галоўлітаўскім экземпляры падпісной карэктуры. Быў упэўнены, што гэтага для Маркевіча хопіць, каб дазволіць". Каленчыц: "А я пра гэта ведаю. Дай, думаю, папытаю. Прызнаешся ці не".

Чацвёртым сустрэчным аказаўся тутэйшы пісьменнік Эдуард Скобелеў. Ён заклапочаны больш пошукамі методыкі, як з твару зямлі сцерці капіталістычны лад і яго ідэалогію. Таму жыццё — не толькі сапраўднае, жывое, але ж і скажонае яго адлюстраванне тут, у гэтым "апараце", — праходзіць міма яго. Дык ён толькі вельмі прасіў, каб я "благожелательно" прачытаў яго апошнюю рэч. Паабяцаў, што я атрымаю "величайшее удовлетворение" ад сустрэчы з ёю.

Дома паведамілі, што двойчы званіў Васіль Быкаў. Хуценька звязваюся з ім. Аказваецца, вячэрнія гадзіны прыёму Кузьмін вырашыў скарыстаць на яго. Выклік перадалі недзе ў той час, калі я быў у тых сценах. Натуральна, яго цікавіў вынік майго візіту. Але ж гэты вынік адносін да справы не мае ці амаль не мае. Дамовіліся, што Васіль Быкаў мяне праінфармуе пра свае вынікі.

Гадзін у дзевяць вечара такую інфармацыю я атрымаў. О, гэта варта зафіксаваць на скрыжалях нашай культурнай гісторыі! А.Т.Кузьмін "папрасіў" Васіля Быкава забраць у выдавецтве рукапіс той злашчаснай аповесці, а замест яе даць іншы твор.

2.12. "Партыя сказала: "Трэба!" — народ адказвае: "Будзе зроблена!", — гаворыцца ў нейкім "мастацкім" творы. "Мёртвых" сваіх аўтар сапраўды забраў, забраў, каб яны больш ніколі не ўваскрэслі. Пра гэта мне пазваніў Серафім Антонавіч. Яшчэ раней Сяргей перадаў загад А.Т.Кузьміна "пракантраляваць выкананне". Нават сказаў, што Васіль Быкаў павінен напісаць заяву на гэты акт. Але ж заявы ніякай не было: мы ніколі не патрабуем іх ад аўтараў у аналагічных выпадках.

Ды, мабыць, Аўтар, атрымаўшы загад на напісанне такой заявы, праігнараваў яго. Аб тым, што такі загад меўся, сведчыць другі званок Сяргея з пытаннем: "Ці забраў аўтар аповесць і ці падаў заяву?". Адказваю, што забраў, але заявы мы не патрабуем ніколі.

3.12. А 23-й гадзіне Васіль Быкаў паведаміў мне па тэлефоне пра паварот нашай справы ў Маскве на лепшае: "Аповесць выдаць, "падгабляваўшы" дзе трэба. Змясціць пажадана ў тым жа 3-м томе, каб не была заўважана замінка. З галавы дырэктара выдавецтва не павінен упасці ніводзін волас. Пра яго тэлеграму не распаўсюджвацца: яе проста не было".

Вельмі цікава! Васіль Быкаў кажа, што гэта Кузьмін так катэгарычна паставіўся перад М.В.Зімяніным і перамог, калі "габлёўку" можна лічыць перамогаю.

Ага, і яшчэ: Сеўрука быццам бы адхілілі **там** ад далейшага разбору гэтай справы.

У гэтым новым павароце адчуваецца клопат, каб не выплеснулася справа за мяжу, чым я пагражаў у тэлеграме. А "клопат" пра аўтара тэлеграмы — гэта тое ж самае: закрані — стане вядома свету, кананізуюць новага пакутніка. Думаю, што **там** параілі расправіцца з аўтарам тэлеграмы пазней, не звязваючы гэта з "Мёртвымі".

4.12. Сяргей паведаміў пра дазвол на выданне "Мёртвых". Хто дазволіў і ў якой слоўнай форме — не сказаў. Баіцца, каб дзе-небудзь не назваў яго. Гэтая кухня заўсёды, згодна з патрабаваннем яе кухараў, павінна трымацца ў глыбокім сакрэце. І трымаецца! Рэдка хто — з дзесяткаў тысяч, можа, адзін — пасмее нешта расказаць бліжэйшаму сябру на вушка.

Пра прапанаваны стыль адносін да мяне — ні гу-гу. Мажліва, і яму гэтага не адкрывалі. А можа, вырашылі наконт мяне: "няхай памучыцца, паперажывае".

Як бы там ні было, а я пазваніў Серафіму, каб чакалі Аўтара з тым жа рукапісам. Уласна кажучы, рукапіс тут не патрэбны быў бы, паколькі том набраны цалкам, прайшоў усе карэктуры і знаходзіўся да забароны на стадыі матрыцыравання. Але ж "габлёўку" павінны выканаць у рукапісу, а з яго перанесці праўкі — гэта азначае калецтвы — у наборныя формы.

Серафім павіншаваў мяне з перамогай. Я не знайшоўся, што адказаць. Стаміўся страшэнна. Ды і не можа мяне задаволіць гэтая тайная паўмера: выпусціць, пакалечыўшы. Каб супакоіць грамадскасць і ў той жа час не прапусціць у твор чэкістападлюгу і іншае некаму не пажаданае.

5—6 снежня, субота, нядзеля. Адпачываю. Вырашыў нават прыняць удзел у вяселлі жончынага пляменніка і хросніка. Сярод шчырых беларускіх людзей сапраўды адпачыў. Не было шматзначна маўклівых бонзаў — начальнікаў і іх ліслівых служак. Усе былі аднолькава вясёлыя, ветлівыя. Кожны быў чалавекам і ў кожным бачыў і адчуваў чалавека.

7.12. Завітаў на працу. Адусюль сыпаліся віншаванні. Адной групе ў калідоры сказаў, што вельмі хацеў бы кожнага з вас калі-небудзь павіншаваць з нечым падобным. За ўсіх адказаў Н.: "Далёка не ўсе здольны так паступаць". Я: "Заўсёды так паступаць, можа, рызыкоўна. Але хаця б раз у жыцці паступіць так кожны, лічу, абавязаны".

Дадому правёў мяне Н. — не той нядаўні мой апанент, а другі, не супрацоўнік выдавецтва. Ён трапіў да мяне першы раз. Прыйшоў у захапленне ад маёй бібліятэкі, папрасіўся ў чытачы. За каваю выказаў свае адносіны да "справы": "Зайздрошчу, калі добры чалавек яшчэ і барацьбіт за добрае".

[...]

11.12. 10 гадзін раніцы. Званок Васіля Быкава:

— Чулі апошнія навіны?

— Не, не чуў, — адказваю.

— Ну дык вось: учора расказаў мне Кузьмін, што прынята пастанова сакратарыята ЦК КПСС па нашай справе. Выпуск аповесці забаронены канчаткова.

— Значыцца, перамаглі самыя ашалелыя, — кажу. — Перамог "пакрыўджаны" Сеўрук. Мабыць, ён узняў там усю чорную сотню на абарону прагнілых яе ідэй.

— Думаю, што ён, — згадзіўся Васіль Быкаў і дадаў: "Відаць, вы ў пастанове не фігуруеце. Хоць гэта ўжо добра..."

Нічога добрага тут няма. Я выдатна ведаю, што **там** ёсць цэлы арсенал розных хітрых і прамалінейных, "тонкіх" і нахабных, "высакародных" і самых подлых метадаў барацьбы з іншадумцамі, утаймоўвання непакорных.

У пастанове могуць і не назваць таго, хто "правініўся", а зробяць так званы пратакольны запіс. Вось ад тону гэтага "запісу" і будзе залежыць яго лёс. Можна і без "запісу", проста вусна "парэкамендаваць" мясцовым кіраўнікам. Скажам, паступова, не адразу, вызваляцца ад яго паслуг, лавіць на іншых учынках. І ўжо "за іх", не звязваючы з гэтым, адмераць яму на ўсю катушку.

Сімвалічна, што гэтае антыканстытуцыйнае рашэнне прынята вярхоўнай інстанцыяй у Міжнародны дзень правоў чалавека, што абвешчаны ААН і своеасабліва адзначаецца ў СССР — дзе-нідзе сходамі, артыкуламі.

14.12. Як паведаміў мне С.А.Андраюк, сёння Васіль Быкаў вярнуў рукапіс 3-га тома. Замест "Мёртвых" паставіў нешта, здаецца, з 4-га тома. 4-ты давялося таксама перэтрасаць. Але ж гэта мяне ўжо не вельмі цікавіць. Вялікая эпапея, можна лічыць, закончылася. Закончылася трыумфам сеўрукоў, іх перамогаю над выдаўцом, над Аўтарам, над літаратурай, над культурай наогул. Але ж гэта перамога толькі часовая. Ды й зусім не перамога, а грубая, нахабная дэманстрацыя ўлады. Гэтая перамога — сапраўднае паражэнне. Каб дамагчыся яе, ім давялося паказаць сваё сапраўднае нутро і сваю воўчую пашчу. Што ж датычыцца пераможаных, дык іх паражэнне — не паражэнне, а **перамога**. Выдавец паказаў, што ёсць (не яшчэ, а ўжо) людзі яго прафесіі, якія не хочуць быць робатамі, якія могуць рашуча змагацца за сапраўдную літаратуру, а ворагаў яе і іх дзеянні смела называць так, як яны гэтага і заслугоўваюць...

[...]

17.12. Цырк на дроце ды і толькі... Смех смехам, але ж сапраўды густую кашу я заварыў. Аніяк не могуць праглынуць. Колькі разоў здавалася, што ўсё, праглынулі ўжо, а глядзіш... панясло яе зноў на паверхню, і зноў пачынаюць жаваць і перажоўваць, каб часам заварот кішак не здарыўся.

Пра гэтыя страўнікавыя пакуты паведаміў мне толькі што Сяргей:

— **Там** "вярнуліся" да вашай справы. "Вырашылі"... друкаваць аповесць.

— Калі і дзе? — пытаюся.

— Правільна ставіце пытанне. Калі? Недакладна. Дзе? У гэтым жа зборы твораў. Трэба, вядома, "дапрацаваць" яе. Каб не затрымліваць 3-ці том у вытворчасці, мабыць, рыхтаваць трэба ў 4-ты.

— Гэта канчаткова? — устаўляю не зусім да месца пытанне (хто ж тут здольны адказаць за **тых!**).

— Так мне перадалі для вас. Аўтару цяпер пра гэта кажа Кузьмін. Дарэчы, заўтра ён і вас запрашае на 9 гадзін раніцы. Можа, што і болей даведаецеся.

Праз якую гадзіну пазваніў і Аўтар. Ён сапраўды атрымаў "даручэнне" "дапрацаваць" для 4-га тома. Павіншаваў. Я выказаў надзею, што "дапрацоўка" не закране кожнае старонкі.

— Ні ў якім разе, — адказаў. — Я ведаю "вострыя" мясціны, іх і буду "закругляць".

— А не будзе кантрольнага чытання **там**? — пацікавіўся я.

— Кузьмін прама не сказаў, а з ускосных яго разважанняў такую выснову можна выцягнуць.

— Хаця б на ім "кантроль" абмежаваўся, — кажу, — а то яшчэ запатрабуюць **туды**.

— Калі гэта здарыцца, дык трапіць да больш добразычлівых, у аддзел культуры. Я так зразумеў, будучы ў Кузьміна, што найгоршы канец схадайнічаў аддзел прапаганды, Сеўрук. А цяпер за справу ўзяўся аддзел культуры.

Цяжка сказаць, што лепш: таленавіты, але пакалечаны твор ці нічога? Думаю, тут будзе пароўну і "за", і "супраць" — мець пакалечаны, але ж каб нешта было — адна магчымая думка. А другая: не трэба пакалечанага. Твор жа гэты ёсць, таленавіты, бескампрамісны. Ну і што, што не дазваляюць друкаваць? Прыйдзе час — надрукуецца. А каму вельмі трэба, няхай знойдзе ў "Маладосці" ці ў "Новом мире". І прачытае сапраўдны твор.

Шчыра кажучы, я за другое. Паўстаўшы за публікацыю аповесці, я не разлічваў на яе магчымае калецтва, я хацеў дзесяткам тысяч чытачоў аблегчыць азнаямленне з ёю, з такой, якой яна была створана. Атрымаўшы накаут, я лічыў за найлепшае спыніць выданне збору твораў Васіля Быкава на другім томе. Няхай бы пасля нехта тлумачыў, што, як і чаму.

Такой думкі ў адзін час трымаўся і сам Аўтар. Пасля ён адступіўся ад яе. Можа, гэта і правільна. Інакш зламалі б, знішчылі б яго, і свет страціў бы творцу. Таму я і не абвінавачваю Васіля Быкава. Нават шкадую: гэта ж ён сваімі рукамі павінен калечыць сваё дзіця. Хоць цяпер ужо і гэтага няма чаго баяцца — усё адбываецца і адбудзецца ў даўно знаёмым усяму свету стылі савецкага друку: амаль кожны твор мае два альбо і больш варыянтаў — варыянт, створаны аўтарам, і варыянт, дазволены партыяй і яе цэнзурай. Часцей за ўсё гэты апошні толькі і вядомы чытачу. Аповесці "Мёртвым не баліць" "пашанцавала": аўтарскі варыянт ужо "праскочыў" у свет, ён жыве і будзе жыць вечным дакорам свайму малодшаму пачварнаму брату.

Публікацыя М.М.ДУБЯНЕЦКАЙ.
Падрыхтоўка да друку А.УРБАНА.

Скандалы

Главный гей Беларуси защищает свои честь и достоинство

Днями председатель совета Белорусской лиги свободы сексуальных меньшинств Эдвард Тарлецкий подал иск в суд на редакцию газеты "Двое дайджест" о защите чести, достоинства и деловых качеств.

Как сообщили в пресс-службе лиги, в одном из июльских номеров в "Двое дайджест" была опубликована статья "Нужна ли нам такая "Лига"?", в которой журналисты, не посчитав нужным ознакомиться с целями и задачами Белорусской лиги свободы сексуальных меньшинств, делают провокационно-надуманный вывод о том, что и сама организация, и ее председатель Э.Тарлецкий находятся в оппозиции к властям. "Показав свой резко оппозиционный характер, Лига уже стала "красной" тряпкой для власти...", — заявляет "Двое дайджест".

В своем иске Эдвард Тарлецкий просит суд изложенную в статье информацию признать недействительной и, вместе с опровержением, взыскать с газеты один миллиард белорусских рублей и перечислить взысканную сумму на счет Национального центра по профилактике СПИДа.

— В этой статье, — комментирует Тарлецкий, — просматривается явное желание сформировать у общественности и государства негативное отношение к Белорусской лиге свободы сексуальных меньшинств именно в то время, когда организация проходит процесс регистрации в Министерстве юстиции. Я хочу еще раз повторить, что Белорусская лига свободы сексуальных меньшинств — **неполитическая** организация. Ее основная цель — объединить представителей сексменьшинств, лиц с ВИЧ/СПИД и других граждан для распространения идеи гражданской толерантности, защиты их прав, свобод, интересов.

Марина КОКТЫШ.

Футбол

Минское "Динамо" меняет коней на переправе

Интрига 8-го национального чемпионата Беларуси по футболу, похоже, приказала долго жить. Или, по крайней мере, вот-вот это сделает. Ибо несмотря на тот факт, что до финиша первенства командам в общем-то еще шагать и шагать (12 туров), сомневающихся в конечном успехе могилевского "Днепра-Трансмаша", пожалуй, уже не осталось. Уж слишком велик его отрыв от ближайших преследователей, которым вряд ли уже удастся достать шествующего в гордом одиночестве лидера. Очередным шагом на пути к заветному "золоту" стал для "Днепра" прошедший на днях 18-й тур, после которого тот еще больше увеличил свой отрыв. В центральном матче тура могилевчане "пустили под откос" "Локомотив-96" — одного из претендентов на место в тройке призеров (правда, после этого шансов у витеблян на попадание туда заметно поубавилось).

Воспользовавшись очередной осечкой теперь уже, наверное, экс-кандидата на "золото" столичного "Торпедо" (автозаводцы, похоже, еще не пришли в себя после драматичного поражения от минского "Динамо" в прошлом туре) в игре против середняка-"Немана", на чистое второе место вышел БАТЭ, привезший из поездки к "Нафтан-Девону" три очка.

Вслед за ним пристроилась "Белшина", которая благодаря победе над "Гомелем" слегка поправила свое турнирное положение, перебравшись с пятого места на третье.

Тихой сапой подбираются к группе лидеров минские динамовцы, перешедшие, как известно, не так давно под крыло государства. Из колеи их не выбил даже недавний вылет из Кубка чемпионов, что подтверждается двумя подряд выигрышами в первенстве страны — сначала у "Торпедо" и теперь у "Торпедо-Кадино". И это несмотря на то, что состав команды омолодился почти наполовину. Но, обретя стабильность, подкрепленную реальными дензнаками, а не пустыми обещаниями своего бывшего босса Евгения Хвастовича, флагман отечественного футбола постепенно выходит "из комы". К слову, на днях в тренерском штабе динамовцев произошли некоторые изменения. Старшим тренером назначен известный специалист Вениамин Арзамасцев, перед этим работавший одним из тренеров сошедшего с дистанции из-за финансовых проблем "Динамо-93". Ему будет ассистировать Юрий Курненин. Что касается руководившего командой Владимира Курнева, то он будет заниматься селекционной работой. По мнению гендиректора и главтренера "Динамо-Минск" Михаила Вергеенко, все это должно возродить былые традиции динамовского клуба. И, как видим, делать это будет кому. Ведь на тренерском мостике "Динамо" оказалось сразу четыре человека, причастных к легендарному "Динамо" 1982 года...

Результаты 18-го тура: "Динамо" (Мн)—"Торпедо-Кадино—2:1; "Белшина"—"Гомель"—2:0; "Коммунальник"—"Динамо" (Бр)—1:0; "Днепр-Трансмаш"—"Локомотив-96"—2:0; "Молодечно"—"Шахтер"—0:1; "Неман"—"Торпедо"—0:0; "Нафтан-Девон"—БАТЭ—0:1.

	и	в	н	п	м	
1.Днепр-Трансмаш	17	14	1	2	38—7	43
2.БАТЭ	17	10	2	5	32—19	32
3.Белшина	17	9	4	4	30—13	31
4.Торпедо	17	8	6	3	31—13	30
5.Гомель	17	8	6	3	21—14	30
6.Динамо Мн	16	8	3	5	25—17	27
7.Славия	16	7	6	3	23—18	27
8.Локомотив-96	17	7	4	6	17—15	25
9.Торпедо-Кадино	17	7	4	6	21—19	25
10.Неман	16	5	6	5	13—19	21
11.Динамо Бр	17	6	1	10	21—27	19
12.Шахтер	17	5	4	8	16—31	19
13.Нафтан-Девон	17	3	2	12	13—32	11
14.Коммунальник	17	1	4	12	6—36	7
15.Молодечно	17	1	1	15	13—40	4

Следующий, 19-й тур, пройдет 14—15 августа.

Дмитрий ЕРМАК.

Решите задачу

О.Захаров



Белые: Kpd8, Фе8, Cd4, пп. f7, h5 (5).

Черные: Kph7, Лg7 (2).

Мат в 2 хода.

Предлагаем вниманию любителей шахмат двухходовую миниатюру украинского составителя Олега Захарова. Попробуйте найти ее решение. Свои ответы присылайте по адресу: 220030, Минск, ул.Энгельса, 34а, редакции газеты "Народная воля", "Шахматы".

Кто есть кто

Международная федерация шахмат (ФИДЕ) опубликовала рейтинги ведущих шахматистов мира по состоянию на 1 июля 1998 года. Список возглавляет чемпион мира Гарри Каспаров — 2815. По сравнению с показателем на 1 января рейтинг Каспарова снизился на 10 пунктов. На вторую позицию вышел индийский гроссмейстер Вишванатан Ананд — 2795 (+25). Как видим, разрыв между лидерами сократился на 35 (!) пунктов. На последующих местах: 3. Владимир Крамник (Россия) — 2780 (-10); 4. Василий Иванчук (Украина) — 2730 (-10); 5. чемпион мира ФИДЕ Анатолий Карпов (Россия) — 2725 (-10); 6. Алексей Широв (Испания) — 2720 (+10); 7. Гата Камский (США) — 2720; 8. Майкл Адамс (Англия) — 2715 (+45!); 9. Петр Свидлер (Россия) — 2710 (+20); 10. Веселин Топалов (Болгария) — 2700 (-40)- 11. Евгений Бареев (Россия) — 2690 (+15); 12. Сергей Рублевский (Россия) — 2685 (+20); 13. Борис Гельфанд (Беларусь) — 2675 (0); 14. Валерий Салов (Россия) — 2670 (-10).

В первую сотню вошли еще два белорусских спортсмена. Гроссмейстер из Могилева Алексей Федоров с рейтингом 2600 занимает 84-е место, минчанин Алексей Александров с рейтингом 2595 — 89-е место. Последний в первой сотне имеет рейтинг 2590.


Из копилки миниатюр

Е.Мочалов — С.Бегун


Чемпионат Беларуси 1988 года

1. d4 Kf6 2. c4 c5 3. d5 d6 4. Kc3 g6 5. e4 b5 6. cb a6 7. a4 ab 8. C:b5+ Kfd7 9. f4 Cg7 10. Kf3 Ca6 11. Cd2 (Угрожало 11. ...C:c3 и 12. ...C:b5) 11. ...o-o 12. o-o C:b5 13. ab Л:a1 14. Ф:a1 Фb6 15. Лe1 C:c3 16. C:c3 Ф:b5 17. f5 Ka6 18. Фc1! Kc7 19. Фh6 Ke8 20. Kg5 Kef6 21. K:h7! **Черные сдались.**


№1. "Конверт"




№4. "5"




№2. "Народная"




№5. "0"



№3. "Воля"



№6. "0"



"Народная воля"-500

Не пройдет и недели, как читатели "Народной воли" получат юбилейный пятисотый номер любимой газеты. В этой связи редакция проводит конкурс на лучшее решение шашечных композиций, посвященный этому событию.

В конкурсе предлагается для решения шесть позиций, каждая из которых в первоначальной расстановке в какой-то мере причастна к юбилею газеты.

Все конкурсные позиции специально подготовлены и любезно предоставлены редакции мастером спорта по шашечной композиции минчанином Борисом Ивановым.

Во всех композициях ход белых.

№1 "Конверт". Связь "газета — читатель"

Белые: простые a5, a7, c5 (3).

Черные: простые c3, c7, e5 (3).

Выигрыш.

№2 "Народная"

Белые: простые d6, e3, f4, g5, h6 (5).

Черные: простые a3, b4, c5, e7, f8 (5).

Выигрыш.

№3 "Воля"

Белые: простые b4, c3, d2, e1, f2, g3 (6).

Черные: простые a5, b6, c7, e5, e7, g5 (6).

Выигрыш.

№4 "5"

Белые: простые e1, f4, g1, h4 (4).

Черные: дамка h8, простые f6, h2 (3).

Ничья.

№5 "0"

Белые: простые a5, c7, d2, f2, g3, h4 (6).

Черные: простые b4, b6, c3, d8, e7, f6, g5 (6).

Выигрыш.

№6 "0"

Белые: дамки b2, b4, e1, f2, простые c1, c5, d2, g7, h4, g3 (10).

Черные: дамка h6, простые a3, c7, d6, e7, f8 (6).

Запереть дамку и простую черных.

А теперь условия конкурса. Три победителя, правильно решивших все шесть конкурсных заданий, будут отмечены призами редакции. Если правильно решивших будет больше, то лауреатов определит жребий.

Решения следует посылать не позднее трех недель со дня опубликования заданий (контроль по почтовому штемпелю) по адресу: **220030, Минск, ул.Энгельса, 34а, редакции газеты "Народная воля", "Шашки".**

Желаем всем успехов!

Борис АГАШИН, мастер спорта.

Среда, 12 августа

БТ

07.00 Доброе утро, Беларусь!
08.00, 13.00, 15.00, 18.00, 23.50 Новости.
08.15 "Сегодня с вами...".
08.50 Потребительская корзина. Социально-экономическая программа.
09.05 Мультфильмы.
09.25 Народы Беларуси: история, культура, быт.
09.55 Око. О рекламе и не только...
10.15 Компьютерный полигон.
10.40 Сериал "Блистательные Азераки".
11.25 Видимо-невидимо.
12.25 Фрагменты юбилейного концерта "Песнярам" — 20".
13.15 "Пять вечеров". Спектакль Ч. 2-я.
14.05 "Музыка спортивных арен". Видеозарисовка.
14.15 К 85-летию народного артиста Беларуси А.В.Богатырева. Вокальный цикл на стихи П.Бровки.
15.15 Видеокурс французского языка.
15.45 Сериал "Девочка и океан" (Австралия).
16.10 Мультфильм.
16.20 III Международный фестиваль народной музыки в Поставах. Ч. 2-я.
17.00 Д/ф "Золотой плес".
17.50 "Национальный художественный музей". Видеозарисовка.
18.20 Телесериал "Блистательные Азераки". (Франция). 3-я с.
19.05 Д/ф "Купальские травы и напитки".
19.15 Белорусский хит-парад.
19.20 "Сегодня с вами...". Начальник управления культуры Столбцовского райисполкома Анатолий Греков.
19.55 Королевская охота.
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.55 "Киностружка".
22.15 Х/ф "Ва-банк" (Польша, 1981 г.). Криминальная комедия в ретро-стиле. После освобождения из тюрьмы, куда его упрятал вероломный сообщник, медвежатник Квинто обдумывает план мести. Его бывший сообщник Крамер теперь стал респектабельным банкиром. Квинто решает обокрасть банк.
00.05 "Темная комната".

ОРТ

08.00, 11.00, 14.00, 17.00, 22.55 Новости.
08.15 Сериал "Роксолана — пленница султана".
09.00 Тема.
09.45 В мире животных.
10.30 Джентльмен-шоу.
11.15 Программа "Вместе".
14.20 Мультсериал "Тин-Тин идет по следу".
14.45 Классная компания.
15.15 Зов джунглей.
15.40 Сериал "Лето наших надежд".
16.10 ...До шестнадцати и старше.
16.30 Вокруг света.
17.20 Сериал "Роксолана — пленница султана".
18.05 Час пик.
18.30 "Золотая лихорадка".
19.10 Человек и закон.
19.45 Спокойной ночи, малыши!
20.00 Время.
20.35 Детектив "Вербовщик".
22.25 "Женские истории".

РТР

06.30, 10.00, 16.00, 19.00, 22.30, 23.50 Вести.
08.30 Православный календарь.
07.35 "Чиполлино". Мультфильм.
08.15 Старая квартира. Год 1953-й. Ч. 1-я.
09.10 Сериал "Санта-Барбара".
13.30 Мультфильмы "Прекрасная Маргарет и Черри-Флей", "Тайна запечного сверчка".
14.00 "Позвоните Кузе!"
14.30 Сериал "Собачий мир".
15.00 "Башня".
15.30 Сериал "Первые поцелуи".
16.30 Осторожно, модерн.
17.00 Сериал "Вихрь цветов".
17.55 Кроссворд.
18.25 Ток-сериал "Марьина роща".
19.35 Сериал "Мистер Бин—черная змеюка".
20.20 Криминальная драма "Джованни Фальконе" (Италия).
22.35 Сериал "Агата Кристи. Пуаро".
23.35 Дежурная часть.
00.10 Горячая десятка.

КУЛЬТУРА

07.05, 13.00, 19.30, 23.00 Новости культуры.
07.25 Д/ф "Нормандия".
08.20 "Театр и я".
09.00, 11.00, 15.00, 17.00 Новости.
09.05 Д/ф "Эверглейдс — остановившееся время".
09.30 "Времен связующая нить".
09.50 "Страницы театральной пародии". Фильм 5-й. "Театр купца Епишкина".
10.30 "Золотая карта России".
11.05 К.Сен-Санс "Рондо каприччиозо".
11.15 "Петербургский гурмэ".
11.35 "От Моисеева к Моисееву".
12.30 "Образ жизни".
13.15 "Вместе с Фафалей".
13.30 "Петербургские сюжеты".
13.55 Концерт оркестра "Молодая Россия".
14.35 Без визы. "Бирмингем".
14.45 "Народные умельцы".
15.05 Мультфильмы "Как казаки невест выручали", "Гришкины книжки", "Крылья", "Первая зима".
15.55 "Лукоморье".
16.15 "Фотопортрет".
16.30 "Играет Валерий Ковтун".
17.05 "2003". К 300-летию Санкт-Петербурга.
17.10 Академия спорта.
17.30 "Мир авиации". Авиасалон "Берлин - 98".
17.55 "Затесы Виктора Астафьева".
18.45 "Встречи в Мариинском театре".
19.15 Чудо-сказка.
19.50 "Остров Александра Сокурова".
20.45 После новостей...
21.05 Х/ф "Геттисберг". 3-я с.
22.00 "Гостюхин". Исповедь актера.
22.30 "Вспоминая конкурс".

НТВ

05.00, 09.00 Сегодня утром.
08.05 Сериал "Детектив Нэш Бриджес".
09.15 Исторический фильм "Залив счастья".
10.40 Мультфильм "Сокровища затонувших кораблей".
11.00, 13.00, 15.00 Сегодня днем.
11.25 "Старый телевизор".
13.15 Сериал "Любовь и тайны Сансет Бич".
14.00 Сериал "Человек из Суэца".
15.20 "Улица Сезам".
15.50 Х/ф "Бронзовая птица". 3-я с.
17.05 Криминал.
17.15 Впрок.
17.25 Док. сериал "Криминальная Россия. Современные хроники".
18.00, 21.00 Сегодня вечером.
18.40 Романтическая комедия "Коррина, Коррина" (США, 1994 г.).
21.50 Сериал "Детектив Нэш Бриджес".
22.40 Сегодначко.
23.15 Х/ф "День свиньи" (Италия).

8-й канал

18.00 Программа Кеннета Копланда.
18.30 Для детей "Пострелята".
18.45 Многосерийный фильм "Пряничный домик".
20.00 Аэробика "Новый Эдем".
20.45 Сериал "Горец".
22.15 Боевик "Ожидание смерти".

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: (017) 229-28-71.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 229-29-04.

Індэкс 63222.

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

Рэгістрацыйнае пасведчанне №246. Нумар газеты надрукаваны з дыяпазітываў у ПП "Мэджык". Адрас: г. Мінск, вул. В. Харужай, 13. Падпісаны ў друк у 21.00. Фармат А-2. Тыраж: суботні — 61050 экз., у другія дні — 55000 экз. Заказ №954